# Знаёмства з лексікай, звязанай з выкананнем рэжыму дня, на ўроку беларускай мовы

**І. Я. Ралько,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 10 г. Пинска

*Мэта:* вучыць адрозніваць беларускае маўленне ад рускага на слых; навучыць распазнаваць і вымаўляць гук [дз’] і словы з ім; пазнаёміць з лексікай, звязанай з выкананнем рэжыму дня; фарміраваць уменні асэнсавана ўспрымаць беларускую мову на слых; вучыць адказваць на пытанне, карыстаючыся словамі самога пытання, правільна і дакладна ўжываць словы пры канструяванні сказаў па ўзоры; выхоўваць дысцыплінаванасць; прывучаць да здаровага ладу жыцця. *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:* падручнікі, сшыткі, малюнкі, адпаведныя тэме, гадзіннік ці яго выява, простыя і каляровыя алоўкі.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**

*Традыцыйнае прывітанне на пачатку ўрока:*

**Настаўнік:** Прывітанне, новы дзень!

**Вучні:** Прывітанне, школа!

**Настаўнік:** Дзень вучэбны пачынаем!

**Вучні:** Працоўны, вясёлы!

**Настаўнік:** Зноў мы разам – дружны клас!

**Вучні:** Справы добрыя ў нас!

Настаўнік:

Бор спявае, сонца свеціць, жыта спее ў палях…
Прыгажэйшая на свеце – беларуская зямля!
Падрастай, маленькі буслік, і да воблачкаў крыляй!

Мы жывём у Беларусі – гэта наш спрадвечны край.

Наша мова, як крынічка, – чыстая і звонкая!

Берагу яе я словы, бо лічу скарбонкаю!

**2. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў**

**<u>2.1. Гульня «Перакладчыкі» - “Скарбонка”</u>**

Перакласці словы на беларускую мову (настаўнік ці нехта з вучняў з куфэрка астаюць малюнкі, дзеці, гледзячы на іх, называюць па-беларуску, малюнкі размяшчаюцца на дошцы):

бумага лук картошка горшок аист конфета платье клюква носки домик ежевика стакан свёкла огурцы тыква рисунок кисточка учитель учебник тетрадь ножницы карандаш дедушка бабушка мама папа буква яблоко перемена доска морковь белка

- Шмат слоў у нашай скарбонцы!

Але няма яшчэ тых, што дасталіся нам на мінулым ўроку!

**<u>2.2. Гульня «У Зайкі-Загадайкі”</u>**

- Я прынесла вам ліст ад Зайкі-Загадайкі. Ён, як заўсёды, даслаў нам свае загадкі. Прапаную адгадаць і папоўніць імі нашу скарбонку! (Па меры паступлення адказаў выявы прадметаў замацоўваюцца на дошцы (перемяшчаюцца) бліжэй да слоў-малюнкаў “скарбонкі”.)

Дом драўляны ў пакоі стаіць,
у гэтым доме адзенне вісіць.
Дзверы ёсць,і ёсць ключы.
Што за дом? Ну, не маўчы! (*Шафа*.)

Вас цікавіць навіна? Вось яна!
Вы чакалі казку? Калі ласка!
Трэба вам кіно? Вось вам і яно!
Усё раскажа і пакажа — мы сябруем з ім даўно. (*Тэлевізар*.)

Неахайных і мурзуляў
Вельмі-вельмі не люблю я.
І з усмешкай прамяністай
Сустракаю дзетак чыстых.
Ты сябе ўбачыш , калі глянеш у мяне!
У тваёй кватэры я на шафе, на сцяне. (*Люстэрка*.)

Лежабоку, гультая,
Так хацеў бы скінуць я.
Тым, хто любіць працаваць,
Мне спачын прыемна даць:
Ляжа хлопчык на мяне –
Хутка соладка засне. (*Ложак.*)

Пыласосам мяне гладзяць, выбівачкай мяне б'юць –
Я маўчу – не разумею - то шкадуюць, то скубуць!
Палажылі мяне ў зале, каб цяплей, мякчэй ступалі. *(Дыван.)*

На яе ўсе селі і глядзяць кіно: насупраць тэлевізара стаіць яна даўно.

Але кот Пушок кіпці сваіх лапаў вельмі часта драпае, точыць аб … (Канапу.)

(Карысна нагадаць падабенства гучання ў рускай і беларускай мовах слова "дыван", дадаткова агучыць значэнне слова па-руску і па-беларуску.)

**2.3 Паўтарэнне лексікі**

*(дынамічны адпачынак: дзеці рухамі суправаджаюць прагаворванне верша)*

Далоні ўгору, твар вясёлы – (рукі падымаюць далонямі ўверх, далей – указваюць на твар),

нездарма прыйшлі мы (далонькі на сябе) у школу (далоні акрэсліваюць асяроддзе):

будуць вушкі (кранаюцца вушэй)слухаць,

вочкі (указальны жэст на вочы) уважліва глядзець.

Вучні (хлопчыкі ўстаюць або падымаюць абедзьве рукі), вучаніцы(дзяўчынкі ўстаюць) –

роўненька сядзець! (селі, злажылі рукі перад сабою)

Вусны (паказваюць на вусны) скажуць словы

Ўслых на роднай мове.

Настаўнік або нехта з вучняў, здымаючы з дошкі, паказвае выявы прадметаў “скарбонкі” паўторна, вучні іх называюць. Куфэрак-скарбонка адстаўляецца.

**3. Маўленчая размінка (вымаўленне гука [дз’])**

**3.1. Знаёмства з гукам [дз’]**

— У беларускай мове ёсць прыгожы гук, які нагадвае гучанне званочка «дзінь-дзінь-дзінь» (*Выявы кветкі-званочка і металічны званочак,* якім настаўнік, прагаворваючы [дз’], можа пазваніць; мажліва, пры наяўнасці часу, выканаць пераклад – рус.колокольчик, а таксама падкрэсліць мнагазначнасць слова). Гэта гук [дз’]. Патрэніруемся ў вымаўленні гэтага гука.(*Вымаўленне ізаляванага гука [дз’].*)

Хто ў прыродзе выдае такія гукі? (*Падбор гукавых асацыяцый: камар, чмель, пчала і г. д.*)

**3.2. Дагаворванне слоў, выразаў, паўтарэнне**

Настаўнік называе склад, вучні хорам яго рытмічна паўтараюць некалькі разоў, пакуль настаўнік не назаве слова або выраз. Потым вучні вымаўляюць хорам:

*Дзе-дзе-дзе , дзе-дзе-дзе, дзё-дзё-дзё — дзённік,*

*дзе-дзе-дзе, дзе-дзе-дзе — дзеці скачуць у вадзе,*

*дзі-дзі-дзі, дзі-дзі-дзі — дзіва, дзіва, дзінь-дзінь-дзінь,*

*дзю-дзю-дзю, дзю-дзю-дзю — дзюбкай дзяцел дзюбаў.*

Работа з табліцай (вучні, што ўмеюць чытаць, могуць услых прачытаць), імітацыя гукаў, называнне выяў: фота, малюнкаў.

**3.3. Вызначэнне гука *[дз’]* у словах**

– Паслухайце верш і вызначце словы з гукам [дз’], пачуўшы гэты гук у слове, адзначце плясканнем у далоні. (*Верш прагаворваецца з выразнай артыкуляцыяй крыху запаволена, пры чытанні верша настаўнік трымае ў руках гадзіннік або яго выяву.*)

Мой гадзіннік,

Дзінь-дзінь-дзіннік,

Зазвініць ён,

Дзінь, дзінь, дзінь –

Значыць,

Сем якраз гадзін...

Трэба з ложка паднімацца,

На заняткі

Не спазняцца.

*А. Дзеружынскі.*

– Што абазначае слова «гадзіннік» – ён перад вамі? Ёсць у вас такі прадмет дома? Як гэты прадмет называецца па-руску? Па-беларуску «час» (рус.) — «гадзіна». У колькі гадзін вы ўстаяце? Што або хто вас будзіць: гадзіннік ці мама? Паўтарыце словы, у якіх вы пачулі гук [дз’].

<u>**3.4. Гульня «Перакладчыкі»**</u>

– Скажыце па-руску: *гадзіна, час, гадзіннік*.

Перакладзіце на беларускую мову: *часы, время, час* (*вымаўляцьпа-руску*). Сачыце, ці правільна я называю малюнкі. Калі я дапушчу памылку, выпраўце, калі ласка, мяне.

**4. Вывучэнне новай тэмы**

<u>**4.1. Уступная гутарка**</u>

– Што паказвае гадзіннік? Для чаго нам трэба ведаць, колькі зараз часу? (*Прымаюцца адказы па-руску.*) Сапраўды, гэта дапамагае ўсё рабіць у свой час, выконваць пэўны парадак, рэжым дня.

– Парадак – гэта вельмі важна! Паслухайце, што адбываецца ў жыцці дзяўчынкі, калі яна не сябруе з парадкам.

<u>Верш “Раскідач” з наступным дотыкавым абмеркаваннем.</u>

**Фізкультхвілінка (музычная)**

*Дзеці спяваюць і выконваюць рухі пад беларускую народную песню <u>“Саўка ды Грышка”</u>*

<u>**4.2. Работа па падручніку (с. 18)**</u>

• Падрыхтоўка да слухання

– Давайце паглядзім, які рэжым дня ў Ганны, Саўкі і Грышы.

Пакажыце дзяцей на першым малюнку, назавіце іх імёны. Слухайце ўважліва, знаходзьце адпаведны малюнак у падручніку.

Ганна, Саўка і я, Грыша,
Мы раскажам вам аб тым,
Як жывём і дружым мы,
Як расцём мы дужымі.

**Пачынаем дзень спачатку**
**фізкультурнаю зарадкай.**

(*Пакажыце малюнак.*)

– Падыміце руку тыя, хто таксама пачынае дзень з зарадкі. (*Апошняе двухрадкоўе вымаўляецца хорам з рухамі*.)

Возьмем шчоткі, часта-часта
зубы чысцім шчоткай з пастай.

**З мылам мы пад кранам мыем**
**Рукі, вушы, твар і шыю.**

(*Знайдзіце адпаведны малюнак.*)

– Давайце вымавім разам са мной і пакажам рукі, вушы, твар і шыю.

(*Апошняе двухрадкоўе вымаўляецца хорам з рухамі*.)

За сталом утрох сядзім.
Мы з ахвотаю ядзім.

(*Пакажыце малюнак.*)

Мы і дома пасабляем:
Я падлогу падмятаю,
Фартушок надзеўшы, Ганна
Мые кубачкі старанна.
Саўка добра справу знае –
Ён вазоны палівае.

(*Адкажыце, гледзячы на малюнак, што робяць Грыша, Ганна і Саўка.*)

Дом вялікі. На двары
Шмат гуляе дзетвары –
Разам з імі, як сябры,
Мы гуляем на двары,
Водзім карагоды.
Весела заўсёды.
(*Пакажыце малюнак.*)

— Колькі часу вы звычайна праводзіце на вуліцы? Чым вы займаецеся там?

**<u>Кнігі мы не забываем,</u>**
**<u>кнігі ўважліва чытаем.</u>**

*Паводле А. Александровіча.*

— Які малюнак падыходзіць да гэтых слоў? Колькі часу вы чытаеце? Давайце вымавім словы з гукам [дз’], якія пачулі ў вершы: *дзетвара*, *сядзім*, *ядзім.*

**<u>• Хвілінка адкрыццяў</u>**

– Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана, як дзеці ядуць. Як вы думаеце, што намаляваў мастак: снеданне, абед, вячэру ці падвячорак?
Якое слова вам зразумелае без перакладу? Што такое «вячэра»? Чаму так назвалі?
Што такое «падвячорак»? Здагадайцеся, што значыць «снеданне». Калі снедаюць?
Калі абедаюць? Калі вячэраюць?

**<u>4.3. Работа па падручніку (с. 19)</u>**

– Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана снеданне. Як вы здагадаліся? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстраваны абед. Дзе абедаюць вучні? Што з’ядаеце ў школьнай сталоўцы вы? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстраваны падвячорак. Чым дзеці падсілкоўваюцца на падвячорак? Знайдзіце малюнак, на якім адлюстравана вячэра. Хто вячэрае? Назавіце членаў сям’і. Чым яны вячэраюць? (*Настаўнік паказвае малюнкі на старонцы падручніка. Вучні адказваюць, што гэта: абед, снеданне, падвячорак ці вячэра*.)

**Фізкультхвілінка (дынамічная)**

Робім усё мы па парадку:

Прачынаемся, зарадка,

Чыста мыемся, затым

Мы сняданак свой ядзім.

Крочым у школу на ўрокі,

веды каб дамоў прынесці,

там працуем мы старанна,

абед каб з апетытам з'есці.

Да падвячорка адпачнём

І зноўку справы мы пачнём.

На паветры пагуляем,

Дапаможам маме.

А пасля вячэры смачнай

Пачытаем самі.

"Добрай ночы!" – скажам усім –

І ў ложку ўжо ляжым.

Вось такі ў нас рэжым!

**5. Замацаванне вывучанага**

5.1. Работа ў сшытку (урок 8, выбарачна)

5.2. Работа з дэманстрацыйным матэрыялам: аднаўленне паслядоўнасці прыёму ежы на працягу дня.

Настаўнік выклікае да дошкі некалькіх вучняў, дае кожнаму дэманстрацыйны малюнак і просіць дзяцей стаць у такой паслядоўнасці, каб атрымаўся правільны рэжым харчавання. Вучні расказваюць пра свае малюнкі. Потым усе разам паўтараюць: ***снеданне, абед, падвячорак, вячэра***.

**6. Вынік урока**

— Які гук беларускай мовы мы навучыліся вымаўляць? Што цікавае вы даведаліся пра рэжым дня? Як называецца прадмет, які паказвае час? Паўтарыце па парадку назвы прыёмаў ежы.

**7. Рэфлексія**

- У залежнасці ад настрою, што вы атрымалі на ўроку, вазьміце ў наш цягнічок з сабою стужку: жоўценькую, аранжавую або чырвоную.

Увага! Цягнік пачынае свой рух!

**<u>Гульня “Цягнік”</u>**

Пад “Трасуху” пачынае рух адзін з вучняў, да яго, па меры руху між радамі класа, далучаюцца дзеці, “чапляючыся” адной рукой за папярэдняга і трымаючы ў другой каляровую стужку.

– Дзякую! Добрага адпачынку вам пасля плённай працы!

## Літаратура


1. **Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя:** вучэб. дапам. / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. – Мінск: Вышэйшая школа, 1996. – 655 с.

2. **Беларуская мова: план-канспект урокаў:** 1 клас / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. – 4-е выд. – Мінск: Аверсэв, 2020. – 138 с.

3. **Вось якія мы: вершы, казкі, байкі, апавяданні беларус. пісьменнікаў пра дзяцей:** для мал. шк. узросту / уклад. І. М. Страмок; маст. І. М. Лобан. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2002. – 272 с.

4. **Марціновіч, Л. С.** Сцяжынка: тэксты па азнаямленні з навакольным светам, казкі, вершы, апавяданні, загадкі і г. д. / Л. С. Марціновіч, Т. У. Юрэвіч, Л. У. Іўліева. – Мінск: Народная асвета, 1994. – 319 с.

5. **Мацвеенка, У. І.** Староначкі з моўнай скарбоначкі: вершы, песні, казкі, загадкі: для мал.шк. узросту / У. І. Мацвеенка; маст. Н. І. Кійко. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2008. – 224 с.

6. **Незабудкі: вершы: для мал.шк. узросту** / уклад. У. І. Карызна, Я. І. Хвалей. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 336 с.

7. **Пралеска: хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатковай школы** / уклад., уступ.арт. А. І. Сачанкі. – Мінск: Выд. Іл. М. Скакун, 1997. – 704 с.